# «ЕЎРАНЬЮС» РАСКАЖА ПРА II ЕЎРАПЕЙСКІЯ ГУЛЬНІ ЎСЯМУ СВЕТУ

**Фонд «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» і тэлеканал «Еўраньюс» заключылі дагавор аб інфармацыйным супрацоўніцтве. Подпісы пад дакументам паставілі дырэктар фонду Георгій КАТУЛІН і дырэктар па міжнародных продажах сусветна вядомага тэлеканала К'ел ШТАЙН.**


Фота БелТА.

Паводле дагавора «Еўраньюс» вырабіць і размесціць у эфіры больш за 532 відэаролікі, прысвечаныя Беларусі ўвогуле і II Еўрапейскім гульням у прыватнасці. Акрамя таго, у эфір выйдуць і знаёмыя еўрапейскаму гледачу праграмы аб падарожжах і турыстычнай галіне — «Фокус», «Метраполітэн», «Паштоўкі», а таксама серыя спартыўных рэпартажаў аб падрыхтоўцы Мінска да маштабнай кантынентальнай падзеі «Дарога да...».

*— Сёння мы адкрываем новую старонку ў прасоўванні II Еўрапейскіх гульняў як у Еўропе, так і ў свеце ў цэлым. Раней Дырэкцыя падпісала пагадненні з шэрагам сродкаў масавай інфармацыі, аднак тэлеканал «Еўраньюс» сярод іх займае асаблівае месца. Аўдыторыя канала перавышае 400 млн тэлегледачоў, а праграмы транслююцца на 12 мовах. Акрамя таго, «Еўраньюс» мае яшчэ і інтэрнэт-рэсурс, які публікуе матэрыялы на дзевяці мовах. Усё гэта гарантуе шырокі ахоп аўдыторыі, —* лічыць Георгій Катулін. *— Наша супрацоўніцтва з вядомым тэлеканалам таксама абумоўлена паспяховай практыкай прасоўвання ім I Еўрапейскіх гульняў у Баку і Еўрапейскіх юнацкіх алімпійскіх фестываляў у Тбілісі і Дзьёры. Тыя рэпартажы мелі станоўчы водгук з боку спецыялістаў спорту, балельшчыкаў і СМІ.*

Дырэктар фонду таксама адзначыў, што ўзаемадзеянне з «Еўраньюс» — не проста канал перадачы інфармацыі, а творчае супрацоўніцтва, паколькі эфірныя матэрыялы будуць распрацоўвацца сумеснымі намаганнямі. Гэта вельмі важна з пункту гледжання абмену вопытам і спадчыны Гульняў. Такое супрацоўніцтва дасць магчымасць выйсці на іншы ўзровень работы па асвятленні многіх значных мерапрыемстваў, якія плануецца правесці ў краіне, прычым не толькі спартыўных.

*— Для нас вы ўстанавілі высокую планку, —* падкрэсліў К'ел Штайн. *— той жа час гэта вялікі гонар і бясцэнны вопыт работы ў такім маштабным праекце, як II Еўрапейскія гульні.*

Тэлеканал «Еўраньюс» зробіць для беларускага боку два ролікі «Дарога да...» перад стартам Еўрапейскіх гульняў. Сюжэты раскажуць пра арэны, Вёску спартсменаў, а таксама аб спадчыне, якую пакінуць пасля сябе Еўрапейскія гульні. Карэспандэнт тэлеканала сустрэнецца з атлетамі незадоўга да старту форуму, наведае трэніроўкі і задасць пытанні аб іх мэтах на II Еўрапейскіх гульнях, аб трэніровачным працэсе. А дзевяць штодзённых рэпартажаў асветляць вынікі спаборніцтваў, цырымоніі адкрыцця і закрыцця. Акрамя таго, «Еўраньюс» ... Аднаго са сваіх спартыўных журналістаў на час правядзення Гульняў тэлеканал камандзіруе ў Мінск.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# НЕ МАЕ АНАЛАГАЎ!

**Калумбійскія медыкі зацікавіліся беларускім прэпаратам супраць раку**

**Арыгінальны супрацьпухлінны прэпарат «Тэмадэкс», распрацаваны навукоўцамі Белдзяржуніверсітэта, выйдзе на фармацэўтычны рынак Паўднёвай Амерыкі.**

Урачы-нейрахірургі з пяці клінік Калумбіі сустрэліся з кіраўніцтвам БДУ. У склад дэлегацыі, якая наведала беларускую ВНУ, увайшлі спецыялісты па вывучэнні, абследаванні і лячэнні розных формаў анкалагічных захворванняў. У рамках афіцыйнага візіту ў Беларусь спецыялісты прынялі ўдзел у правядзенні аперацыі ў Гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Мінска з выкарыстаннем «Тэмадэкса». Правялі яе прафесар кафедры нервовых і нейрахірургічных захворванняў БДМУ Аляксандр Фядулаў і ўрач-нейрахірург найвышэйшай катэгорыі Дзмітрый Веевнік.

«Тэмадэкс» распрацаваны навукоўцамі НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ і вырабляецца на прадпрыемстве «Унітэхпрам БДУ». Прэпарат не мае сусветных аналагаў і ўяўляе сабой гідрагелевую тэрапеўтычную сістэму для лакальнай хіміятэрапіі злаякасных пухлін галаўнога мозга. Ён прымяняецца для знішчэння ракавых клетак, якія засталіся пасля правядзення хірургічнай аперацыі, і прадухіляе рэцыдывы: даказана, што лекавы сродак павялічвае працягласць жыцця пацыента. У найбліжэйшы час плануецца абмеркаваць дэталёвыя пытанні па пастаўцы прэпарату ў калумбійскія клінікі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Прадстаўнік Паўднёвай Карэі стаў новым прэзідэнтам Інтэрпола

Прадстаўніка Паўднёвай Карэі Кім Чон Яна абралі новым прэзідэнтам Інтэрпола, гаворыцца ў Twitter арганізацыі. Галасаванне прайшло на 87-й сесіі генеральнай асамблеі арганізацыі ў Дубаі. Акрамя Кім Чон Яна, на пасаду прэтэндаваў генерал-маёр расійскага МУС Аляксандр Пракапчук, які займае пасаду віцэ-прэзідэнта Інтэрпола па Еўропе. Выбары новага кіраўніка ведамства абвясцілі пасля таго, як у кастрычніку падаў у адстаўку ранейшы прэзідэнт Міжнароднай крымінальнай паліцыі Мэн Хунвэй. Ён знік у канцы верасня, пазней яго знайшлі ў Кітаі, дзе супраць яго распачалі справу аб карупцыі. Пасля сыходу Хунвэя ў адпаведнасці з правіламі часова выконваючым абавязкі прэзідэнта Інтэрпола стаў Кім Чон Ян, які раней займаў пасаду старшага віцэ-прэзідэнта арганізацыі. Як адзначае BBC, на самай справе, прэзідэнт Інтэрпола ў значнай ступені сімвалічная пасада. Аператыўнае кіраўніцтва арганізацыяй і каардынацыю паміж краінамі — членамі ажыццяўляе іншы орган — генеральны сакратарыят. Ім з 2014 года кіруе прадстаўнік Германіі Юрген Шток.

## Падчас выбуху на сустрэчы багасловаў у Кабуле загінула звыш 50 чалавек

Звыш 50 чалавек загінула і больш чым 80 атрымала раненні ў выніку выбуху ў палацы шлюбаў у Кабуле, дзе вядомыя святары сабраліся на свята ў гонар дня нараджэння прарока Мухамеда. Выбух адбыўся ў банкетнай зале. Як перадае тэлеканал Tolo News, у той момант у зале знаходзілася каля тысячы чалавек. Як мяркуецца, выбуховае прыстасаванне прывёў у дзеянне смяротнік. Аб гэтым са спасылкай на прадстаўніка МУС Афганістана паведаміла агенцтва Рэйтэр. Прадстаўнік палаца шлюбаў, памяшканні якога выкарыстоўваюцца для палітычных і рэлігійных сходаў, паведаміў агенцтву Франс прэс, што смяротнік падарваў сябе, прабраўшыся ў гушчу людзей. Па колькасці ахвяр гэта адзін з самых буйных нападаў у Афганістане за апошнія месяцы.



У кастрычніку хваля гвалту пракацілася па краіне падчас парламенцкіх выбараў. Напады і выбухі ў Афганістане рэгулярна здзяйсняюць прадстаўнікі тэрарыстычных груповак «Талібан» і «Ісламская дзяржава». Паводле рашэння прэзідэнта Афганістана, 21 лістапада быў абвешчаны днём жалобы.

## Выяўлена жыллё тэрмітаў памерам з Вялікабрытанію

У Бразіліі навукоўцы выявілі гіганцкую сістэму тэрмітнікаў, плошча якой супастаўная з плошчай Вялікабрытаніі. Даследаванне апублікавана ў навуковым часопісе Current Biology. Каманда біёлагаў з Бразіліі, Вялікабрытаніі і ЗША пад кіраўніцтвам энтамолага Стывена Марціна з брытанскага ўніверсітэта Солфарда выявіла тэрмітнікі на паўночным усходзе паўднёваамерыканскай краіны, у каацінгу — сухім лесе. Вышыня тэрмітнікаў складае каля двух з паловай метраў, а дыяметр у падножжа — прыкладна дзевяць метраў. 200 мільёнаў пагоркаў размешчаны ў шахматным парадку на адлегласці каля 20 метраў адзін ад аднаго. Усяго тэрмітнікі займаюць плошчу ў 230 тысяч квадратных кіламетраў. Для параўнання: плошча Вялікабрытаніі складае 242,5 тысячы квадратных кіламетраў. Біёлагі палічылі гэтую сістэму самай буйной на Зямлі. Навукоўцы мяркуюць, што кузуркі віду Syntermes dirus жывуць не ў саміх пагорках, а ў тунэлях пад зямлёй. Тэрміты, памер якіх складае каля аднаго сантыметра, выкідвалі лішнюю глебу на паверхню, так і з'явіліся шматлікія кучы. Усяго яны дасталі каля 10 кубічных кіламетраў зямлі, што супастаўна з аб'ёмам чатырох тысяч пірамід у Гізе. На гэтую работу ў насякомых сышло каля 3,8 тысячы гадоў. Марцін заклікаў прызнаць сістэму тэрмітнікаў прыродным цудам свету. Ён адзначыў, што энтамолагам пакуль не ўдалося выявіць месцазнаходжанне каралевы тэрмітаў. Тым не менш яны ўпэўненыя, што сістэма тэрмітнікаў дагэтуль населеная.

## Культасвета

# Увесь гэты джаз

**Міжнародны фестываль JAZZinMinsk збярэ сусветна вядомых выканаўцаў**

22—25 лістапада на пляцоўках Палаца прафсаюзаў і Палаца Рэспублікі пройдзе ўжо сёмы Міжнародны джазавы фестываль JAZZinMinsk, які дазволіць публіцы пачуць жыўцом найлепшых выканаўцаў з ЗША, Бразіліі, Нідэрландаў, Іспаніі, Францыі, Латвіі, а таксама — упершыню — афра-карыбскі аркестр музыкантаў з Марцінікі, Пуэрта-Рыка, Гаіці, Трынідада, Ямайкі і Антыгуа. У праграме — некалькі дзясяткаў імёнаў, у тым ліку зоркі балтыйскага джаза Эвеліны Пратэкторэ, вядомага ўсяму свету па фільме «Браты Блюз» саксафаніста Уіла Полака з Канзас-Сіці, выдатнага гітарыста Элісеа Ларэда, легендарнага спевака, флейтыста, саксафаніста і бубнача Дэдэ Сен-Пры, які сумяшчае тытулы найлепшага музыкі Афрыкі і рыцара Ганаровага легіёна Францыі...

«Мінск — сапраўдная сталіца сусветнага джаза!» — сцвярджае кіраўнік Джаз-клуба і музыкант Яўген Уладзіміраў, прадстаўляючы фэст. У якасці доказу выконвае на ўнікальным клавішным трамбоне некалькі пазнавальных мелодый і нагадвае, што ўжо больш як 15 гадоў у Палацы прафсаюзаў штомесяц праходзяць канцэрты так званага джазавага абанемента, а фестываль, як флагманскі праект, збірае добрую сотню знакамітых джазменаў з усяго свету.

«Часта гавораць, што джаз — музыка чорных. Але ў нас выступаюць і чорныя, і белыя, і жоўтыя, і абсалютна ўсякія музыканты, суцэльны інтэрнацыянал, які дэманструе, што джаз — музыка, якой падуладныя ўсе кантыненты», — гаворыць старшыня аргкамітэта фестывалю, старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва Уладзімір Карагін. Дзякуючы яму фестываль мае падтрымку з боку як дзяржаўных, так і бізнес-структур, ад Міністэрства замежных спраў і Мінінфармацыі да «Белавія» і аўтамабільных брэндаў. Мінскі фэст выклікае ўвагу мноства замежных слухачоў. Сёлета, напрыклад, спецыяльна прыедзе публіка з Фінляндыі, Швецыі, Польшчы, Латвіі і Украіны, якая жадае і пачуць знакамітых джазменаў, і наладзіць бізнес-сувязі з беларускімі прадпрымальнікамі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## Будзь у курсе!

# У ЦЯГНІК — З ВЕЛАСІПЕДАМ

**Беларуская чыгунка правядзе абсталяванне месцаў для правозу веласіпедаў у цягніках рэгіянальных ліній эканом-класа з ненумараванымі месцамі, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.**

На першапачатковым этапе месцамі для правозу двухколавых машын абсталююцца два саставы: электрацягнік ЭР9 і дызель-цягнік ДР1А ў галаўных вагонах (для трох веласіпедаў у кожным вагоне). Устаноўленыя на рухомым саставе канструкцыі пройдуць выпрабаванні трываласці мацавання. У далейшым месцамі для правозу веласіпедаў плануецца абсталяваць увесь маторвагонны рухомы састаў рэгіянальных ліній эканом-класа.

Таксама ў планах Беларускай чыгункі абсталяванне гэтага рухомага саставу адмысловымі месцамі для правозу буйнагабарытнай ручной паклажы. Усе работы плануецца зрабіць пры правядзенні планавых рамонтаў рухомага саставу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


**РУП «Торговый дом «Восточный»
извещает о проведении 26.12.2018 открытого аукциона
по продаже недвижимого имущества**

**Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 623/С-58052, общей площадью 915,7 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., г. Узда, ул. Карла Маркса, 130Д. Назначение: столярно-плотницкая мастерская, наименование: 2 99 99 здание неустановленного назначения. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 625650100002000260 площадью 1,0930 га. **Начальная цена продажи – 194 400,00 рубля, задаток – 19 440, 00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Капитальное строение с инвентарным номером 211/С-6151, общей площадью 405,6 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Миоры, ул. Коммунистическая, 47. Назначение: материальный склад, наименование: материальный склад. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 223350100001000292 площадью 3,0611 га. **Начальная цена продажи – 43 243,20 рубля, задаток – 4 324,32 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3.** Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-97391, общей площадью 92,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Витебск, ул. Гагарина, 11П. Назначение: здание специализированное для бытового обслуживания, наименование: прачечная. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 240100000001009879 площадью 0,0183 га. **Начальная цена продажи – 35 370,00 рубля, задаток – 3 537,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %**

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) – Претендент на покупку, не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством РБ для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством РБ

**Аукцион состоится 26.12.2018 в 14.00 по адресу:
г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал**

Задаток перечисляется на р/с BY81POIS30120021178401933001, БИК POISBY2X, ОПЕРУ ОАО «Паритетбанк», 220002 г. Минск, пр-т Независимости, 77, ОКПО 37411910, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом 26 декабря 2018 года.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 14А, управление реализации недвижимости и арендных отношений в рабочие дни: пн. – чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15. Окончание приема заявлений: 20.12.2018 в 14.00.

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента в любое время до объявления его проданным**

**Контакты организатора аукциона:
+375 17 351 00 01; +375 17 380 27 37; +375 44 763 62 63**